

# ГАРАДОК Марыя Тамашаўна

Нарадзілася ў 1938 годзе ў в.Падбалоцце Зэльвенскага раёна.

Свой працоўны шлях пачала ў 16-гадовым узросце пасля заканчэння Падбалоцкай пачатковай школы. Працавала ў сельскай гаспадарцы, на малочна-таварнай ферме "Князева". За час працы ў гаспадарцы зарэкамендавала сябе добрасумленным і адказным работнікам.

Ёй прысвоены званні "Ударнік камуністычнай працы", "Майстар жывёлагадоўлі 1-га класа".

Неаднароазова выходзіла пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод жывёлаводаў калгаса і ўзнагароджвалася знакам "Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва".

Пастановай праўлення калгаса "Прагрэс", партыйнага камітэта і прафкама калгаса ад 01.02.1983 г. за вялікія заслугі ў развіцці калгаснай вытворчасці Гарадок М.Т. занесена ў кнігу Працоўнай Славы гаспадаркі.